УДК 398.3

*Ж.С. ЦЕРАХАВА*

# ГРАД У ПАВЕР'ЯХ І ПРЫКМЕТАХ БЕЛАРУСАЎ

Усемагутныя прыродныя стыхіі ўяўляліся стражытным беларусам жывымі істотамі, здольнымі бязлітасна караць земляроба за нейкую правіннасць, за нязначнае адхіленне ад спрадвечна заведзеных канонаў. Град быў адной з такіх стыхій.Назіральныя людзі заўважылі, што ён найчасцей бывае ў канцы мая ці ў пачатку лета, значна радзей здараецца ў канцы лета ці восенню. Як бачым, ён вельмі небяспечны для маладых пасеваў, таму прымушаў хлебароба зведаць голад, асацыіраваўся з заўчаснай смерцю. Каб папярэдзіць бяду, старажытныя беларусы імкнуліся разгадаць таямніцы прыроды і паўплываць на хмары разнастайнымі магічнымі дзеяннямі. Так з'яўляліся прыкметы і павер'і, былічкі і абярэгі.

Ва ўяўленнях беларусаў не было адназначнага погляду на прычыны ўзнікнення граду. Праўдзівай з'яўляецца ўпэўненасць народа, што град утвараецца з замёрзлых кропелек вады, але выпадзенне яго прыпісвалася звышнатуральнай сіле: «Град робіцца з таго, што на небе замярзае тая вада, што сачыцца праз шчыліны, той лёд, бы саплякі, адрываецца ат неба да й падае на хмары. Там ён таўчэцца на дробныя кускі. От як зхочэ Бог каго пакараць, та й вяліць зграбаць той лёд на землю» [6, с. 38]. У той жа час гул, што ўзнікае ў небе, калі сутакаюцца хмары, даў падставу на існаванне не менш распаўсюджанага пераканання, быццам град утвараецца ў выніку барацьбы святых з нячыстай сілай: «Перад тым, як павінен падаць град, чуваць, як уверсе гудзе. Гэта *анёлы да святыя ваююць да б'юцца з нечысцю*, пакуль хто-каго асіліць ды сыпне градам» [6, с. 39]. Таму сяляне назіралі за выглядам, рухам хмар, што ўяўляліся ім рагатай жывёлай, імкнуліся распазнаваць, ад якой з іх што можна чакаць. У заклінаннях, якія гучалі ў час адгону жудасна-страшных хмар, іх называлі белымі нябеснымі статкамі кароў, авечак. Водгук гэтых павер'яў знаходзім у замовах. Напрыклад, у Мазырскім раёне ў час выгану жывёлы ў поле гаспадыня кажа: «Ішло тры хмаркі па небу: адна хмарка дажджавая, другая – снегавая, а трэцяя – градавая. Як дож, дай бог малачко, як снех – смятану, як град – сыр» [9, с. 11].

«Хмара, каторую здалёк чутно, як ідзе, мармочучы, ета хмара градавая, да калі яшчэ чорная, то й перуновая. Проці яе няможна рабіць ніякіх знахарскіх хвокусаў або лаяць, бо ёю правіць святы Ілля, дак боязна, штоб не рассердзіць... Градавую хмару можна пазнаць не толькі па масці, да і па том, што ў ёй шуміць і патрэскуе» [10, с. 15]. Пры гэтым старажытныя людзі былі ўпэўнены, што «градам бог карае людзей за грахі, бо ат граду няма людзям ніякой карысці, а толькі бяда» [6, с. 38]. Таксама заўважана, што град бывае рэдка ноччу ці раніцай, часцей ён назіраецца днём, ідзе палоскамі ад некалькіх метраў да некалькіх кіламетраў. Гэта дало падставу старажытнаму чалавеку меркаваць, што справядлівы Бог, які ўсё бачыць, карае апаганенае месца, вяртае людзей да захавання ўсталяванага парадку. «Звычай устанавіў бог; от затым трээ дзяржацца звычая, калі хочэш, каб бог не пакараў» [6, с. 121]. У Слуцкім павеце меркавалі, што «затым-то град ніколі не разлягаецца так шыроко, як дождж, а рэжэ паласою толькі поле тых людзей, якіх бог карае» [6, с. 38]. Караў бог людзей, згодна з фальклорна-этнаграфічнымі запісамі, часцей за ўсё за працу ў дні святаў і прысвяткаў. Таму ў Петрыкаўскім раёне сераду, у якую ўстрымліваліся ад работы, каб папярэдзіць град, называлі Святой: «Святые сэрэды – веліконна, пэрэплаўна і ўшэсна – не робяць радзі граду, шо град збівае пасевы» [7, с. 265]. У Маларыцкім раёне таксама лічаць, што «у сухую сэраду не трэба робіці на поле – град выб'е» [7, с. 280]. У гэты дзень, «шчоб граду нэ було, то по полю

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

ходылы; поп чытаў малітву, свяціў поле» [8, с. 279]. Заўважым, што ў нашых продкаў не было адзінага погляду адносна колькасці такіх дзён (1 або 3), сустракаем таксама некалькі назваў: *святая серада, сухая, градавая*, але найбольш пашыраная – *градабітны* дзень. У Фінляндыі, Сербіі таксама назіраем забарону на пэўныя віды працы ў асобныя дні календара, каб не наклікаць град, навальніцу.

Даволі распаўсюджаным у беларусаў было меркаванне, што Бог градам караў жанчыну за грахі: «Калі дзяўчына цяжарная ідзе пад вянец, то ў яе павінны кідаць *камяні*, а то будзе град» [8, с. 72]. У Маларыцкім раёне лічылася, калі «жэншчына, што не схацела гадаваць дзіця і замардавала, чы прыспала, чы ўтапіла – то ад таго і град бувае, і сільны дож бувае» [8, с. 66]. Таксама на Палессі бытавала павер'е, што град будзе ісці цэлы год уздоўж той дарогі, па якой жанчына несла забітае ёю дзіця: «Жэншчына замурдавала дзіця і занесла на другое село, у Пішчу і паклала ў капу. І той дарогаю град усё ішоў, цэлый год да осені і ўсё пабіў – і жыто, і ўсё, усё» [8, с. 66]. Нараджэнне пазашлюбнага дзіця, згодна з запісамі, таксама магло выклікаць град.

Першапачаткова сродкамі барацьбы былі ахвяраванні і маленні, у якіх градавую хмару маглі адпраўляць у *чыстае поле*, за *сіняе мора*, на *татарскія горы*, на *сухі лес*, дзе град не мог прынесці шкоды. «Як набяжыць бурая або чорная градавая хмара, то калі няма ў хаце таго кія, каторым была абаронена жаба ад вужа, то трэба сказаць трэйчы: «Ідзі на сухі лес да й шчэзні там, нячыстая сіла!» – і трэйчы плюнуць» [10, с. 15]. Лік *тры* лічыўся магічным.

Людзі былі перакананы, што град не б'е ў тое месца, дзе своечасова былі выкананы спецыяльныя рытуальныя дзеянні. Так, зімою, на Каляды, не дазвалялася кідаць прынесеныя ў хату дровы, каб град не пабіў пасевы, а на Грамніцы свяцілі вялікія васковыя свечкі, якія, згодна з павер'ямі, ахоўвалі прыроду ад злых сіл: «На Стрэтэнье свецяць свечкі і гавораць, што гэтыя свечкі – ат грому» [8, с. 67]. Іх палілі ў хаце ў час грому, граду, на Палессі разам з хлебам-соллю выносілі на двор. Вясна – час асаблівых святаў і клопату селяніна, таму «на Юр'я беларусы раніцай абходзілі палі, засеяныя азімым, затым на самай мяжы раскладвалі абрус і елі на ім астаткі асвечанай велікоднай ежы. Пасля трапезы, каб град не пашкодзіў летам пасевы, лоб барана, а таксама ўсе косці і крошкі, што засталіся ад пачастунку, пакідалі, закапвалі там жа, на самай мяжы, папярэдне акрапіўшы ямку асвячонай вадою» [10, с. 363]; «каб зберагчы поле ад граду, неабходна на Юр'я ў розных месцах поля ўваткнуць косці ад асвечанага велікоднага мяса» [5, с. 298]. На Палессі для абароны ад граду выкарыстоўвалі сырое яйка, якое перакідвалі цераз хату. Там жа для аховы ад граду маглі выкарыстоўваць велікоднае яйка, выпучанае асаблівым спосабам. Яго закапвалі ў полі ці агародзе пасля Вялікадня. Вялікая выратавальная сіла надавалася абыдзённіку: «каб град не пашкодзіў пасевы, неабходна жанчынам усёй вёскі вясной сабрацца ў адну хату і за адну ноч напрасці і выткаць абрус, які раніцай занесці ў касцёл і асвяціць. Затым павыцягваць з гэтага абруса ўсе ніткі і наматаць іх на калкі вакол усяго поля. Тады Бог захавае ад градабою» [10, с. 275]. Відавочным ва ўсіх выпадках з'яўляецца матыў ахвяравання сілам прыроды, абходу і шанавання мяжы поля, як пераходу.

Актыўная абарона ў час выпадзення граду найбольш захавалася ў памяці старажылаў, а значыць, была досыць распаўсюджанай. Каб папярэдзіць град, беларусы маглі выкарыстоўваць адразу некалькі рытуальных прадметаў: сякеру, касу, серп, нож, матыку (вострыя прадметы), качаргу, хлебную лапату, вілкі (стыхія агню), велікодны абрус ці яйка, асвечаную вярбу, мак ці траву (сувязь з Богам), мятлу (мае дачыненне да Дамавіка і яго ахоўных уласцівасцей), хлеб і соль, велікоднае мяса з бараніны (матыў уміласціўлення). Гэтымі прыладамі або махалі ў бок хмары, або выносілі на двор і ставілі лязом уверх, каб градзінкі рассякаліся.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

«Як сыпне град, у нас выносяць хутчэй на двор дзяжу, лапату, а то веко з дзяжы, а на яго кладуць вобраз святога Міколы. Другія хутчэй адтыкаюць комін да паляць на прыпеку свянцонае зелле мінушкі. Як толькі дымок падымаецца ўгору, та град і сунімецца» [6, с. 38]. Заўважана, што град праходзіць вельмі хутка, таму і згаданая прыкмета аказалася «жывучай». Спынялі і адганяліградавую хмару таксама, узмахваючы нямытым абрусам з-пад велікоднага свянцонага [3, с. 214]. На Палессі ў час граду «сякеру в зямлю страмлялі» [7, с. 303]; часам з пералічанымі рэчамі маглі абыходзіць пабудовы.

Але найбольш вядомы ўсім беларусам былі рытуальныя дзеянні з хлебнай лапатай, пры гэтым заўважаліся адрозненні ў прыватных дзеяннях: яе маглі выкідваць на зямлю (Гом., Бр. вобл.) або класці на страху ці ставіць пад страху хаты (Маг., Бр., Гом., Мінск. вобл.). У апошнім выпадку важна было правільна пакласці лапату. Пры гэтым у межах адной вобласці і нават раёна заўважаюцца адрозненні. Так, у Шклоўскім раёне лапату клалі ўверх адваротным бокам. У Горацкім раёне лапату клалі бляхай уверх, каб градзінкі разбіваліся аб лапату, а не на хлебным полі. У Мсціслаўскім раёне лапату паварочвалі і ставілі пад хату. Лічылася, што так можна адвярнуць хмару. На Піншчыне, як зазначаюць М. і С.Талстыя, хлебную лапату маглі выкідваць, выносіць з хаты і ставіць пад хатай ці абыходзіць з ёю хату, хрысцілі хмару, клалі крыж-накрыж хлебную лапату і качаргу [8, с. 54], а праваслаўныя сербы крыж-накрыж клалі мятлу і вілы. Паварот лапаты вяскоўцы тлумачаць як адварот градавой хмары ад поля, а паварот верхнім бокам – растапленне граду. Выносіла лапату звычайна старая жанчына, якая на гэтай лапаце пякла хлеб. Іншыя градаахоўныя дзеянні выконваліся таксама жанчынамі, часам у ніжніх сарочках, што можна растлумачыць як частковую сімвалічную галізну.

Даволі распаўсюджаным было павер'е: «як пачынае падаць град, трээ хутчэй раскусіць адну градзінку й трэйко сплюнуць, та заплюеш ліхому вочы й ён не трапіць больш, дзе ляжыць град і немагчыме грабці яго на зямлю» [6, с. 38]. Часцей раскусвала градзінку апошняе дзіця ў сям'і, радзей – першае. На сённяшні дзень вяскоўцы ў час выпадзення граду прапануюць гэта зрабіць малому дзіцяці. Лічыцца, калі ён здолее яго раскусіць, а не праглынуць, то град адразу ж перастане. Гэты рытуал, як сцвярджаюць С. і М.Талстыя, з'яўляецца выключна аказіяльным, непасрэдна звязаны з выпадзеннем граду і таму не мае прэвентыўнага варыянта [8, с. 53].

Дробнаму і не частаму граду народ даў наступнае тлумачэнне: «Маленькі град, які не *шкодзіць* пашне, робіцца так: е такія горы, на каторых ляжыць снег, а на ём шарон. *Хмары чапляюцца за тыя горы, заграбаюць з сабою той шарон*, разносяць па свету да й рассыпаюць дзе трапіцца» [4, с. 39]. Знешняе падабенства гэтага граду з крупамі дало падставу для іх атаясамлівання ў загадках як беларускага, так і рускага народаў: «З неба крупы падаюць» [1, с. 108], «Рассыпался горох / На семьдесят дорог; / Никто его не подберет: / Ни царь, ни царица, / Ни красная девица» [2, с. 300]; «От стуку и от грому / Катились каточки / По широкой дощечке. / Увидели зорю, / Полетели в воду» [2, с. 301].

Як бачым, знішчальная сіла граду шырока адлюстравана ў шматлікіх фальклорных творах, аб яго карысці сведчаць толькі адзінкавыя павер'і, згодна з якімі, ён валодаў гаючай сілай: сяляне «першым градам мазалі вочы, каб яны не балелі» [8, с. 55], у Валагодскай, Вязнікаўскай, Уладзімірскай губернях лічылі «град добрым сродкам ад зубнога болю. Яго можна есці, ці, растапіўшы, ужываць для паласкання» [8, с. 195]. Верагоднасць гэтай дапамогі адсутнічае, магчымыя ж выпадковыя супадзенні далі падставу для існавання.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Каб папярэдзіць град, напрыклад, на Беларусі, у Польшчы, на Балканах «калісь не давалі пакойніка адкрытым везці, бо град будзе. Цяпер хаваюць адкрытым» [8, с. 71]. Аднолькава негатыўна ўсе славянскія народы адносіліся да пахавання заложных нябожчыкаў на могілках, бо гэта магло наклікаць град ці засуху.

Як бачым, беларусы заўважылі шмат асаблівасцей утварэння і выпадзення граду, але не заўсёды маглі растлумачыць прычыны і следства. Безабароннасць перад яго знішчальнай сілай дала падставу для жывучасці разнастайным перасцярогам і замовам, прывяла да ўзнікнення пэўных рытуальных дзеянняў, якія выконваліся як у пэўныя дні каляндарных свят, так і непасрэдна ў час выпадзення граду. Бытаванне вялікай колькасці перасцярог ад граду на працягу доўгага часу не магло не адбіцца на іх змесце. Пэўны час яны выконваліся па традыцыі, а зараз і зусім адышлі ў нябыт і толькі зрэдку ўзгадваюцца старажыламі ў час выпадзення граду.

## ЛІТАРАТУРА


1. ***Булгаковский Д.Г.*** Пинчуки. Записки ИРГО по отделению этнографии. – Т. 13. – СПб., 1890.
2. Загадки русского народа: Сб. загадок, вопросов, притч и задач. – М., 1995.
3. ***Никифоровский Н.Я.*** Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи. – Витебск, 1897.
4. ***Попов Г.*** Русская народно-бытовая медицина. По материалам этнографического бюро князя В.Н. Тенишева. – СПб., 1903.
5. ***Романов Е.Р.*** Белорусский сборник. Вып. 8-9. – Вильно.
6. ***Сержпутоўскі А.К.*** Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў. – Мн., 1998.
7. ***Толстая С.М.*** Полесский народный календарь. Материалы к этнодиалектному словарю. Р-Я. // Славянский и балканский фольклор. Этнолингвистическое изучение Полесья. – М., 1995. – С. 257-317.
8. ***Толстые Н.И. и С.М.*** Заметки по славянскому язычеству. 4. Защита от града в Полесье // Обряды и обрядовый фольклор. – М., 1982. – С. 54-83.
9. ***Толстые Н.И. и С.М.*** О задачах этнолингвистического изучения Полесья // Полесский этнолингвистический сборник – М., 1983. – С. 3-21.
10. ***Federowski M.*** Lud bialoruski na Rusi Litewskiej. – T. 1. – Krakow, 1897.



## SUMMARY

*This article deals with the ideas of Belarussian people about the nature and causes of such natural phenomenon as hail, the ways our anscestors fought it being revealed. An attempt to compare our ways of overcoming a disaster with those of the other peoples has been made by the author.*


Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова